Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
8 ВЕРАСНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 174 (29288)



ДОБРЫЯ СПРАВЫ БУДАТРАДАЎ

ЯК РЭГУЛЯВАЦЬ ЛІЧБАВЫ ГАНДАЛЬ?



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ІСАЧАНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця:**

*«Дзейнасць па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі трэба пашырыць на рэгіянальны ўзровень. На ўзроўні дзяржавы мы дасягнулі многага. Але самае галоўнае цяпер — гэтыя дасягненні перанесці на рэгіянальны ўзровень. Важна, каб рэгіёны развіваліся раўнамерна, без адставанняў, каб чалавек незалежна ад месца пражывання адчуваў сябе камфортна, меў работу і заробак, нармальныя дарогі, якасныя ўмовы для жыцця».*

## КОРАТКА

- **Зацверджаны пералік сельгаспрадукцыі для абавязковага страхавання арганізацыямі аграпрамысловага комплексу на 2021 год.**
- У нашай краіне перанесены тэрміны бязвізавага ўезду для гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі 2021 года.
- **Аўтаматызаваная сістэма распазнавання нумарных знакаў з'явіцца ў пункце пропуску «Бераставіца».**
- «Белнафтахім» пацвердзіў падрыхтоўку перакідання нафтапатокаў з Літвы ў парты Расіі.
- **Першую чаргу вялікага кальца вакол Гродна здадуць летам 2021 года.**
- Школы юных пры БДУ адкрываюць новы сезон.
- **Дзень горада ў Мінску пройдзе без масавых гулянняў.**
- «Мінсктранс» аднаўляе штодзённыя рэйсы ў Вільнюс.

ISSN 1990 - 763X

Свята кнігі







Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# Слова, якое яднае

**У Бялынічах адсвяткавалі XXVII Дзень беларускага пісьменства. Што засталося на памяці?**

**Адшумела свята, пакінуўшы на вуснах салодкі прысмак. Цяпер гэта гісторыя, якую можна прыгадваць і перажываць зноў і зноў. Яшчэ раз пра тое, што застанецца ў памяці пасля таго, як усё скончылася і адгрымеў святочны феерверк.**

СТАР. 12–13

Тэхналогіі

# НЕ АПУСКАЙЦЕ РУКІ!

## Якіх поспехаў у лячэнні раку дасягнулі беларускія анколагі?

**Анкалагічныя хваробы, колькасць якіх у Беларусі павялічваецца, займаюць другое месца сярод прычын смяротнасці. Пры гэтым, нягледзячы на рост захваральнасці, усё больш пацыентаў удаецца вылечыць, а суадносіны захварэлых і памерлых зніжаюцца. Як сёння змагаюцца з ракам і якіх поспехаў у гэтым дасягнулі беларускія анколагі, яны расказалі, запрасіўшы журналістаў у навукова-практычны цэнтр.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава знаходзіцца ў Бараўлянах пад Мінскам. На яго тэрыторыі размясціўся сапраўдны медыцынскі гарадок — каля 35 карпусоў, будынкаў і збудаванняў. І колькасць іх расце. Сёння тут працуе дзве тысячы медыкаў. Штодзень праз паліклініку і іншыя падраздзяленні цэнтра праходзіць каля тысячы пацыентаў. Хірургі-анколагі робяць да 70 аперацый у суткі. А ў год гэта каля 16 тысяч — 11-12 тысяч у стацыянары і чатыры тысячы амбулаторна. Штогод дыягностыку і лячэнне ў цэнтры атрымліваюць каля 30 тысяч беларусаў. Але так было не заўсёды.

— Будаўніцтва першага корпуса нашага інстытута ў Бараўлянах пачалося ў 1963 годзе. Да гэтага анкалагічны інстытут размяшчаўся ў корпусе на базе 1-й бальніцы, — расказвае **ўрач-анколаг цэнтральнай экспертнай камісіі па ранняму выяўленню анказахворванняў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр МАШЭЎСКІ.** Ён, дарэчы, пачаў сваю прафесійную дзейнасць яшчэ ў 1955-м і з'яўляецца сведкам і ўдзельнікам фарміравання анкалагічнай службы нашай краіны.

СТАР. 9

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!
Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА